Новае скліканне

# «САМА ІДЭЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА ПЭЎНЫМІ ПАЛІТЫЧНЫМІ АКТАРАМІ ЗНІШЧАЕЦЦА»

**Палітолаг, гісторык, сацыёлаг — гэта про дэпутата Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Эдуарда СЕВЯРЫНА. Ён прадстаўляе ў парламенце Брэстчыну — Лунінецкую акругу № 13. Да абрання ў вышэйшы заканатворчы орган краіны Эдуард Севярын працаваў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце і Беларускім інстытуце стратэгічных даследаванняў. Тэма кандыдацкай дысертацыі вучонага пераклікаецца з назвай парламенцкай камісіі, у якой ён працуе, гэта і паслужыла нагодай для першай размовы на старонках «Звязды».**



***— Эдуард Мікалаевіч, на пачатку інтэрв'ю дазвольце адштурхнуцца ад вашых навуковых інтарэсаў. Чаму для абароны кандыдацкай дысертацыі вы абралі тэму правоў чалавека і ў чым сутнасць вашага даследавання?***

— Калі мы разглядаем катэгорыю правоў чалавека, трэба зразумець, што змест гэтай палітыка-прававой з'явы з'яўляецца агульначалавечай каштоўнасцю, якая характэрна ў пэўных варыянтах абсалютна для любога грамадства, народа, любой палітычнай сістэмы. Правы чалавека існавалі, калі не было яшчэ ні дзяржавы, ні адпаведных законаў, ні самой назвы гэтага феномену. Давайце разгледзім адну з сістэмаўтваральных каштоўнасцяў беларускага народа — права на сям'ю. Як яго разумелі нашы продкі? Яны разглядалі сям'ю як сацыяльны, дадзяржаўны інстытут, які ўтрымлівае глыбокі рэлігійны і духоўны змест. Інстытут, які дапамагае выжываць чалавеку, чалавечаму роду, этнасу, нацыі, у будучыні — дзяржаве.

Нашы продкі яшчэ на дадзяржаўным узроўні грамадства ўжо разумелі, што адыход ад гэтых каштоўнасцяў ні да чаго добрага не прывядзе. Адмаўленне духоўнага і прыроднага — гэта адмаўленне чалавечага развіцця. Сямейныя традыцыі зарадзіліся даўным-даўно: асноўнай функцыяй мужа і жонкі з'яўляецца бацькоўства і мацярынства. Гэта праца «24/7» на працягу дзесяцігоддзяў. З боку дзяцей накладваецца абавязак з павагай адносіцца да старэйшага пакалення...

Яшчэ адна каштоўнасць, якая характарызуе беларускі народ, — верацярпімасць, паважлівыя адносіны да чалавека іншай рэлігіі альбо нерэлігійнага светапогляду. Гэта аснова канфесіянальнай палітыкі дзяржавы. І тут вось што яшчэ важна: свабода сумлення з рэлігійнага пункту гледжання — гэта свабода ад граху, а не свабода ад Бога або грамадства. Менавіта такі падыход павінен рэтрансліравацца ў беларускае грамадства, кожную сям'ю, закладвацца ў выхаванне дзяцей і моладзі.

Дзеці ў наш час выступаюць знакавай з'явай. Мы бачым, што для большасці грамадстваў заходняга тыпу характэрны дэмаграфічныя праблемы. Лічу, што з пункту гледжання правоў чалавека, правоў сацыяльных супольнасцяў існуе толькі адна сацыяльная група, якая можа прэтэндаваць на прынцып прыярытэтнасці — дзеці. Бо дарослыя самі робяць выбар і нясуць за яго адказнасць.

Правы чалавека як палітычная катэгорыя і як агульначалавечая каштоўнасць выступаюць крытэрыем, які дазваляе ацаніць узровень палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця, а значыць — эфектыўнасць палітыкі. Гэта з'ява, якая нас аб'ядноўвае. Бо мы ўсе — людзі.

Першы раздзел Канстытуцыі (асновы канстытуцыйнага ладу) кажа: «Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава». Далей: «чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы». Кожнае палажэнне ўсіх раздзелаў Канстытуцыі прама альбо ўскосна звязана з правамі чалавека, самім чалавекам.

Найвышэйшы канстытуцыйны ўзровень маюць палажэнні другога раздзела Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь «Асоба, грамадства, дзяржава». Сама назва нясе глыбокі філасофскі змест. Яна прадугледжвае каштоўнасць правоў чалавека і самога чалавека. Правы, якімі валодае асоба, правы дзяржавы і правы грамадства ў дачыненні да асобы.

Гэта працуе ў тым ліку з пункту гледжання дыялектычнага адзінства правоў, абавязкаў і адказнасці. Чалавек не жыве сам па сабе. Немагчыма забяспечыць правы чалавека без забеспячэння правоў іншага чалавека, правоў калектыву. А ў палітычным сэнсе калектыў — гэта дзяржава, у сацыяльным — грамадства. Адказнасць прадугледжваецца як для асобы — у дачыненні да грамадства і дзяржавы, так і ад грамадства і дзяржавы — у дачыненні да асобы. Рэалізаваць права на адукацыю немагчыма без выканання абавязку вучыцца. Рэалізаваць права на працу — без абавязку працаваць. Права на медыцынскае абслугоўванне прадугледжвае, што здароўе трэба захоўваць. Кожны чалавек мае права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе. Я вельмі люблю беларускую прыроду. Але часам прыязджаеш на бераг ракі і бачыш, як казалі нашы дзяды: «ці то шляхта гуляла, ці то свінні пасвіліся». Наш абавязак — ставіцца да прыроды ашчадна.

Няма больш або менш значных правоў чалавека. Права дае магчымасць выбару, а свабода дае магчымасць варыянтаў гэтага выбару. Правы чалавека — гэта таксама ідэалогія, важна правільна перадаваць іх сапраўдныя, а не надуманыя змест і гучанне.

Найвышэйшым палітычным інстытутам у нашай дзяржаве з'яўляецца інстытут прэзідэнцтва. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — кіраўнік дзяржавы, гарант Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Канстытуцыя закладвае і замацоўвае за кожным дзяржаўным інстытутам, за дзяржавай, за кожным чыноўнікам функцыю адказнасці па забеспячэнні правоў чалавека.

Канстытуцыя як палітыка-прававая з'ява ўдакладняецца і канкрэтызуецца з пункту гледжання яе рэалізацыі заканадаўчымі актамі ніжэйшага ўзроўню. Кожны з іх, ці то кодэкс, ці то закон, распараджэнне — любы іншы нарматыўны прававы акт не павінен супярэчыць палажэнням Канстытуцыі.

Сёлета мы адзначаем і 80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вельмі сімвалічна ў свеце развіцця нашай дзяржаўнасці, што Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» распачалася 23 чэрвеня 1944 года, а праз 50 гадоў, 23 чэрвеня 1994 года, адбыўся першы тур выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, у Канстытуцыі таксама прапісана, што захаванне гістарычнай памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца абавязкам кожнага грамадзяніна нашай краіны. А калі ёсць абавязак, значыць, ёсць і права — ведаць гістарычныя факты, якія дазваляюць нам вывучаць урокі гісторыі. У 1944 годзе БССР прыйшла да тых геаграфічных межаў, якія характэрныя для сучаснай Беларусі.

За вялікі ўклад, які мы зрабілі ў перамогу над фашызмам, БССР атрымала права стаць адной з краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Фактар беларускага гераізму ўлічваўся з пункту гледжання палітычных граніц тады БССР. Такім чынам мы сталі сапраўдным палітычным актарам, сапраўднай дзяржавай, атрымалі магчымасць удзельнічаць у міжнародных працэсах, напаўняць міжнароднае права беларускім гучаннем. Мы сталі ўдзельнікамі такіх сістэмаўтваральных міжнародных дакументаў у галіне правоў чалавека, як Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. А Рэспубліка Беларусь як правапераемнік БССР нясе гэту адказнасць па сёння. Дарэчы, палажэнні другога раздзела Канстытуцыі «Асоба, грамадства, дзяржава» адлюстроўваюць артыкулы гэтых дакументаў. На сёння і палітычна, і юрыдычна мы рэалізавалі правы беларускага народа на самавызначэнне, права на мір. Мы пабудавалі сваю ўласную дзяржаву.

***— Як жа так атрымліваецца, што правы чалавека сталі перашкодай у міждзяржаўных адносінах?***

— Гэта праблема двайных і нават трайных стандартаў у галіне палітыкі. Так адбываецца, правы чалавека і сам чалавек выступаюць ужо не крытэрыем якасці, а інструментам палітыкі. Прынцыпы правоў чалавека цяпер парушаны. Сама ідэя і сапраўдны змест з пункту гледжання палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, духоўнага, культурнага, проста чалавечага сэнсаў пэўнымі палітычнымі актарамі мэтанакіравана скажаецца і знішчаецца. Так не павінна быць. Але так адбываецца. Мы пачыналі нашу размову з права на сям'ю. Сёння ў некаторых краінах налічваюць больш за 80 гендараў — гэта глупства. Нездарма дэмаграфічны фактар у такіх краінах адзін з самых уразлівых. Бо тут ужо размова ідзе не толькі пра палітыку, але і пра адыход ад агульначалавечых каштоўнасцяў, ад таго, кім на самай справе прызначаны быць чалавек.

Канешне, успрыманне і разуменне правоў чалавека ў розных кутках свету адрозніваецца. Мы ўспаміналі пра Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, ідэя стварэння якога належала краінам капіталістычнага ладу. Эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы былі прэрагатывай краін сацыялістычнага лагера. Інтэграцыя аднаго і другога стварыла шырокую канцэпцыю, якая можа быць успрымальнай любой палітычнай сістэмай, дзяржавай і народам. Але кожны народ, які рэалізаваў сваё права на пабудову дзяржавы, мае ўласную гісторыю станаўлення, свае каштоўнасці. Яны ўпісваюцца ў агульначалавечы змест, але спецыфіка развіцця ў кожнага своя. І забываецца на гэта небяспечна.

Усе народы маюць права на самавызначэнне. Гэта прадугледжвае ўласнае бачанне дзяржаўнасці, кірункаў развіцця і каштоўнасцяў. Беларусь заўсёды была шматканфесіянальнай і шматнацыянальнай. Цяпер у нас пражываюць прадстаўнікі звыш 130 нацыянальнасцяў і 25 канфесій. Мы ўсе розныя, але ўсе мы — беларускі народ. Беларуская нацыя — тытульная, але беларускі народ — гэта людзі самых розных нацыянальнасцяў, веравызнанняў, палітычных поглядаў, сацыяльных груп, эканамічных магчымасцяў. І кожны ўносіць нешта сваё ў аб'яднальны канцэпт — Беларусь. Мы ўзаемадапаўняем адно аднаго і праз гэта робімся больш моцнымі.

***— Пра што сведчыць сама наяўнасць Пастаяннай камісіі па правах чалавека ў беларускім парламенце?***

— Наяўнасць нашай камісіі ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сведчыць аб тым, што кожны чалавек, забеспячэнне яго правоў выступаюць у якасці найвышэйшай каштоўнасці і мэты нацыянальнай палітыкі і работы парламента. Мы адносімся да правоў чалавека як да крытэрыю якасці і палітыкі, і законаў. Асноўная функцыя парламента — заканатворчасць. І кожны дэпутат разумее, што ніводны закон, што прымаецца, не павінен супярэчыць прынцыпам і каштоўнасцям, закладзеным у аснову нашай Канстытуцыі, а гэта значыць — інтарэсам беларускага народа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На пленуме ЦК КПК прымуць палітычны дакумент па рэформах



Трэці пленум Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая (ЦК КПК) 20-га склікання, які праходзіць у Пекіне, прыме палітычны дакумент, накіраваны на паглыбленне рэформ і прасоўванне мадэрнізацыі. Аб гэтым паведаміла газета China Daily. Паводле яе даных, на партыйным форуме 15—18 ліпеня «будзе абмяркоўвацца ключавы палітычны дакумент, накіраваны на паглыбленне рэформ па ўсіх кірунках і прасоўванне мадэрнізацыі Кітая». Газета звяртае ўвагу, што пленум праходзіць на фоне вялікіх чаканняў таго, што будуць зроблены ключавыя крокі для далейшага стымулявання другой па велічыні эканомікі ў свеце і паскарэння яе мадэрнізацыі. Як адзначыў дырэктар пекінскага Цэнтра Кітая і глабалізацыі Ван Хуэйяа, вынікі пленума дадуць магчымасць КНР лепш арыентавацца ў складаных глабальных умовах, прасоўваць пераўтварэнні, мадэрнізацыю і якасны рост эканомікі. Для дасягнення гэтых мэт, лічыць эксперт, партыя павінна працягваць маштабныя рэформы, каб скарачаць разрыў паміж горадам і вёскай.

### ФБР разглядае стральбу на мітынгу Трампа як магчымы акт унутранага тэрарызму

Федэральнае бюро расследаванняў (ФБР) разглядае стральбу на мітынгу экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа як патэнцыйны акт унутранага тэрарызму. Пра гэта гаворыцца ў заяве ведамства, перадае ТАСС. «ФБР расследуе інцыдэнт са стральбой на мітынгу 13 ліпеня ў Батлеры, штат Пенсільванія, у выніку якога загінуў адзін чалавек і былі паранены былы прэзідэнт Дональд Трамп і іншыя гледачы, як замах на забойства і патэнцыяльны акт унутранага тэрарызму», — адзначаецца ў дакументе. У ведамстве падкрэслілі, што не мелі справы з падазраваным да інцыдэнту са стральбой. Там таксама паведамілі, што працягваюць высвятляць, ці былі ў яго саўдзельнікі, хоць расследаванне паказвае цяпер, што ён дзейнічаў у адзіночку. Акрамя таго, ФБР пацвердзіла, што пакуль не высветліла матываў дзеянняў зламысніка, аднак працуе над устанаўленнем паслядоўнасці падзей і вызначэннем яго перамяшчэнняў да таго, як ён адкрыў агонь.

